| | |
|---|---|
| МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ<br>РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ<br>БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ<br>ЎНІВЕРСІТЭТ | МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ<br>РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ<br>БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ<br>УНИВЕРСИТЕТ |
| РАШЭННЕ | РЕШЕНИЕ |
| 25 мая 2015 № 9<br>г. Мінск | г. Минск |

Пасяджэння Савета БДУ
Аб выкананні плана ідэалагічнай
і выхаваўчай рабоце ў БДУ
на 2015-2016 навучальны год

Заслухаўшы справаздачу прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В.Суворава аб выкананні Плана ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ на 2014-2015 навучальны год, а таксама аб задачах у галіне ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце на 2015-2016 навучальны год,

САВЕТ ВЫРАШЫЎ:

1. Ухваліць даклад прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворава аб выкананні Плана ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце ў БДУ на 2014-2015 навучальны год.
2. Зацвердзіць План ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ на 2015-2016 навучальны год. Прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.В.) забяспечыць выкананне гэтага плана ў поўным аб’ёме.
3. Прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.В.), начальніку ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (Багамазаў А.П.) да 25.08.2015 г. распрацаваць план мерапрыемстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
4. Дэканам факультэтаў, кіраўнікам устаноў адукацыі БДУ:

4.1. Правесці інфармацыйна-тлумачальную работу са студэнтамі аб значнасці выбарчай кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і грамадскага жыцця краіны;

4.2. Узмацніць кантроль за выкананнем студэнтамі вучэбнай дысцыпліны, мэтавым выкарыстанні навучальных аўдыторый;

4.3. Узмацніць індывідуальную працу прафесарска-выкладчыцкага складу, накіраваную на фарміраванне адказнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры навучэнцаў для недапушчэння ўцягвання студэнтаў у дзейнасць незарэгістраваных грамадскіх арганізацый і ўдзелу студэнтаў у несанкцыянаваных грамадска-палітычных мерапрыемствах;

4.4. Увесці ў практыку працы дэканата правядзення сумесных пасяджэнняў з прадстаўнікамі моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання факультэта не радзей за 2 разы на навучальны год.

5. Кіраўніку медыяцэнтра БДУ (Салаўёу П.Л.):

5.1. Працягнуць работу па прыцягненні студэнтаў у афіцыйныя групы БДУ ў сацыяльных сетках, напаўненні груп актуальным зместам ў непасрэдным узаемадзеянні са структурным падраздзяленнем, моладзевымі грамадскімі арганізацыямі ўніверсітэта;

5.2. Забяспечваць дыялагічны характар узаемадзеяння ў групах універсітэта ў сацыяльных сетках; аператыўна рэагаваць на пытанні і прапановы, якія паступаюць ад студэнтаў, абітурыентаў і супрацоўнікаў у сацыяльных сетках.

Старшыня Савета С.У.Абламейка

Вучоны сакратар Савета С.М.Ходзін